УДК 377.031

# ПЕДАГАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ ЯК ФОРМА РАБОТЫ ПА АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ І ПАВЫШЭННІ МАТЫВАЦЫІ НА ВЫБАР ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАФЕСІІ НАВУЧЭНЦАЎ У РАМКАХ ПРОФІЛЬНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

***Артихович Н. Н.***
*Греская средняя школа*
*Греск, Республика Беларусь*
*pisch2002@gmail.com*

***Макшицкая М. Н.***
*Греская средняя школа*
*Греск, Республика Беларусь*
*marina.makshickaya@gmail.com*

**Анатацыя.** Разглядаецца вопыт правядзення педагагічнага даследавання як формы работы з навучэнцамі педагагічных класаў.

**Ключавыя словы:** педагагічнае даследаванне, творчы патэнцыял, матывацыя, выбар прафесіі.

Усім даўно вядома тая глыбокая педагагічная ісціна, што схавана ў вядомай фразе “раскажы, пакажы, дай паспрабаваць”. Адным з галоўных фактараў асэнсаванага выбару педагагічнай прафесіі ці адмаўлення ад яе якраз і з’яўляецца магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі педагога, прымерыць рэаліі педагагічнай дзейнасці да свайго характару, тэмпераменту, поглядам на жыццё, сваім магчымасцям і сваім запытам. Факультатыўныя заняткі “Уводзіны ў педагагічную прафесію” сярод іншых задач павінны рашаць і гэту: ствараць умовы для падрыхтоўкі і правядзення педагагічных проб і фарміраваць у навучэнцаў неабходную базу тэарэтычных і практычных ведаў, ствараць матывацыйную аснову для асэнсаванага стаўлення да педагагічнай прафесіі.

Для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў адной з самых выніковых з’яўляецца такая форма работы, як даследаванне. Навучэнцам прапануецца праводзіць міні-даследаванні на педагагічную тэматыку ў рамках вывучэння любой асобнай тэмы ці раздзела. Даследаванні могуць быць рознымі. Умоўна іх можна падзяліць на чатыры групы:

**1. Стандартнае даследаванне** (пытанне, гіпотэза, праверка, вывады).

**2. Даследаванне-параўнанне**. Такое даследаванне вучні праводзяць часцей за ўсё ў адносінах да сябе. Напрыклад, у 11-м класе вучню прапануецца прайсці анкетаванне ці тэст з дапаможніка “Дзённік самадыягностыкі” (Мінск, БГПУ, 2018) і параўнаць рэзультаты са сваімі ж, толькі ў 10 класе. Вынікі параўнання сябе “сённяшнягя” з сабой “мінулагоднім” даюць магчымасць навучэнцу ацаніць свае дасягненні, змяненні ў сваіх поглядах, ведах, навыках,

матывуюць на работу над сабой. Такія даследаванні можна праводзіць з групай навучэнцаў і рабіць высновы франтальна, для групы ці класа.

**3. Даследаванне-анкетаванне.** Сутнасць такога даследавання ў правядзенні анкетавання (апытання) на зададзеную тэматыку і апрацоўка атрыманых рэзультатаў з наступным абагульненнем і вывадамі.

**4. Даследаванне-збор і сістэматызацыя актуальнай інфармацыі па канкрэтнаму** пытанню (напрыклад, работа з матэрыялямі школьнага музея). Матэрыялы такіх даследаванняў не толькі папаўняюць партфоліа навучэнцаў, але і значна абагачаюць метадычную скарбонку кабінета і школьнага музея. Даследаванні тэм з гісторыі школы, педагагічных дынастый і г. д. становяцца цікавым і змястоўным матэрыялам для заняткаў будучых навучэнцаў.

У педагагічных міні-даследаваннях можна не фармуляваць актуальнасць праблемы, а проста шукаць адказ на пытанне, якое ўзнікла сёння, падчас вывучэння канкрэтнага матэрыялу, што само па сабе актуальна.

Тэмы педагагічных міні-даследаванняў можна знайсці па тэме любога факультатыўнага занятку. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Гісторыя станаўлення і развіцця педагагічнай прафесіі" можна прапанаваць такія тэмы педагагічнага міні-даследавання, як "Любімыя настаўнікі маіх бацькоў", "Гісторыя нашай школы ў гады вайны", "Настаўнікі ў шынялях", "Педагагічныя дынастыі нашай школы". Пры вывучэнні тэмы "Інтэлект і навучанне" тэма даследавання "Інтэлектуальная адоранасць і паспяховасць вучня". Тэма заняткаў "Уласцівасці ўвагі", тэма даследавання "Спосабы падтрымкі ўвагі намаганнямі навучэнца". Тэма заняткаў "Тэмперамент", а тэма даследавання "Уплыў тэмпераменту на паспяховасць у педагагічнай прафесіі".

Часта здараецца, што прапанаванае навучэнцам педагагічнае даследаванне дае такія нечаканыя рэзультаты, такія парадаксальныя вывады навучэнцаў, такі выхаваўчы і матывацыйны эфект, якія нельга было прадказаць.

**Педагагічнае міні-даследаванне "Што павінны атрымаць ад настаўнікаў навучэнцы за час вучобы ў школе?"** ставіла сваёй мэтай адказаць на пытанне: "Што ж павінны атрымаць ад настаўнікаў навучэнцы за час вучобы ў школе?" Гэта пытанне ўзнікла не выпадкова. Яно ўсплыло падчас абмеркаванняў патрабаванняў да вучняў педагагічнага класа, да ўмоў залічэння на педагагічныя спецыяльнасці ў ВНУ тых, хто займаецца ў педагагічнам класе і вывучае "Уводзіны ў педагагічную прафесію", пры абмеркаванні патэнцыялу педагагічнага класа і далейшай вучобы пасля школы. У анкетаванні прынялі ўдзел 30 бацькоў, 30 настаўнікаў, 30 вучняў 10–11 класаў.

**Былі прапанаваны наступныя адказы**:

1. Набыць высокі ўзровень ведаў па ўсіх прадметах .

2. Развіць свае творчыя здольнасці і вызначыцца з будучай прафесіяй

3. Атрымаць разуменне, спачуванне, спагаду і дапамогу ў цяжкія хвіліны, словы падтрымкі, веру ў поспех.

4. Захаваць сваё фізічнае і псіхічнае здароўе ў час вучобы, атрымаць трывалыя навыкі здаровага ладу жыцця.

5. Набыць добрыя веды па тых прадметах, да якіх вучань праяўляе схільнасці (збіраецца здаваць ЦТ).

6. Набыць камунікатыўныя навыкі, уменне працаваць і жыць у калектыве.

7. Быць стрэсаўстойлівым, не баяцца памылак.

8. Навучыцца прымяняць прадметныя веды ў рэальным жыцці.

9. Атрымаць высокі ўзровень сацыялізацыі,мець баланс талерантнасці і ўмення абараняць сваю пазіцыю.

10. Уменні аналізаваць і карэкціраваць свае дзеянні для дасягнення сваіх мэтаў.

**Разглядаліся тры першыя адказы рэспандэнтаў і параўноўваліся:**

Настаўнікі лічаць галоўнымі пункты 1,4,8. Бацькі выбралі пункты 2,6,4. Вучні палічылі галоўнымі пункты 5,3,2. Навучэнцы прыйшлі да высновы, што настаўнік, прыходзячы на ўрок, ставіць галоўнымі адны мэты, школьнікі, прыходячы ў школу, лічаць прыярытэтнымі другія, адрозныя ад тых, што маюць на ўвазе настаўнікі, а бацькі разлічваюць на трэція. Удзельнікі адукацыйнага працэсу ставяць на тры першыя месцы розныя адказы. Гэта сведчыць аб тым, што прыярытэты не супадаюць .

**Праблема.** Удзельнікі адукацыйнага працэсу разыходзяцца ў поглядах на тое, што галоўнае павінен атрымаць вучань у школе.

**Прапанова** па рашэнні праблемы: удзельнікі адукацыйнага працэсу павінны прыкласці намаганні для набліжэння сваіх пазіцый. Неабходна размаўляць, дыскутаваць, тлумачыць свае думкі і слухаць іншых. Галоўнае, неабходна зразумець, што мэта ў нас адна – якасная адукацыя і здаровая нацыя!

**Педагагічнае міні-даследаванне “Як уплывае тэмперамент на паспяховасць у педагагічнай прафесіі”** ставіла мэтай знайсці сувязь паміж тэмпераментам і паспяховасцю ў педагагічнай прафесіі. Была выдзвінута гіпотэза, што ёсць тэмпераменты, якія садзейнічаюць поспеху ў педагагічнай дзейнасці. Даследчыкі прапанавалі педагогам школы наступную анкету:

1. Да якога тыпу тэмпераменту вы адносіце свой?
2. На ваш погляд, педагагічная прафесія найбольш падыходзіць людзям з якім тэмпераментам?

Варыянты адказаў: А) бліжэй да флегматыка, Б) бліжэй да халерыка

В) бліжэй да сангвініка, Г) бліжэй да меланхоліка.

Вучні адказалі на пытанні наступнай анкеты:

1. Ваш любімы настаўнік па тэмпераменту.

2. На ваш погляд, педагагічная прафесія найбольш падыходзіць людзям з якім тэмпераментам?

Варыянты адказаў прапанаваліся тыя ж. Рэзультаты анкетавання педагогаў: 36 % лічаць свой тэмперамент найлепшым для педагагічнай дзейнасці, 31 % лічаць, што паспяховасць педагога не залежыць ад тыпу тэмпераменту, 64 % лічаць свой тэмперамент не самым падыходзячым для педагагічнай дзейнасці (заўважым, што самі яны тым не менш паспяховыя ў педагагічнай прафесіі).

Рэзультаты анкетавання вучняў: сярод любімых намі настаўнікаў ёсць настаўнікі з рознымі тыпамі тэмпераменту (прыкладна аднолькавая колькасць), ніхто з вучняў не лічыць тэмперамент "меланхолік" найлепшым для педагога (не любім сумаваць і "грузіцца").

Аналіз рэзультатаў прывёў да высновы:

1. Наяўнасць любога тэмперамента не з'яўляецца перашкодай для атрымання педагагічнай прафесіі.

2. Сярод паспяховых педагогаў прысутнічаюць педагогі з рознымі тыпамі тэмпераменту.

3. Любоў вучняў да настаўніка не залежыць ад яго тэмпераменту.

4. Хочаш быць настаўнікам, будзь ім!

Педагагінае даследаванне, як форма работы актывізуе і развівае творчы патэнцыял навучэнцаў, спрыяе развіццю сацыяльных кампетэнцый, фарміруе навыкі самааналізу, спрыяе развіццю павагі да педагагічнай дзейнасці, асэнсаванаму выбару педагагічнай прафесіі!

## PEDAGOGICAL RESEARCH AS A FORM OF WORK TO ACTIVATE COGNITIVE ACTIVITY AND INCREASE THE MOTIVATION TO CHOOSE A PEDAGOGICAL PROFESSION OF STUDENTS WITHIN THE LIMITS OF SPECIALIZED PEDAGOGICAL TRAINING

***Artikhovich N. N.***
Secondary School of Gresk
Gresk, Republic of Belarus
pisch2002@gmail.com
***Makshytskaya M. N.***
Secondary School of Gresk
Gresk, Republic of Belarus
marina.makshickaya@gmail.com

**Abstract.** The experience of conducting pedagogical research as a form of work with students of pedagogical classes is considered.

**Keywords:** pedagogical research, creativity, motivation, choice of profession.